КАМСАМОЛ ЗРАБІЦЬ ШМАТМІЛЬЕННЫМ

„Ні аднаго цэнтнэра збожжа прыватніку"

КЛІМАУШЧЫНА ДАЕ СЛОВА:

да 14-й гадавіны Кастрычніка выканаць гадавы плян збожжазагатовак

Здана 11 проц. гадавога заданьня

КЛІМАВІЧЫ (Па тэлеграфу).

У раёне шырока разгарнулася масавая работа вакол збожжазагатовак. 16-га жніўня быў арганізаваны ўсераённы чырвоны абоз. Здана 121 тона збожжа. Усяго з пачатку збожжазагатовак паступіла 267 тон, што складае каля 11 проц. гадавога заданьня.

Пашыраны пленум райвыканкому, абгаварыўшы пытаньне аб збожжазагатоўках пастанавіў мабілізаваць увагу калгасьнікаў і бядняцка-сераднякіх аднаасобных гаспадарак на датэрміновае выкананьне пляну з тым каб поўнасьцю ажыцьцявіць гадавое заданьне да 14-й гадавіны Кастрычніцкай рэвалюцыі. 23-га і 30-га жніўня арганізуюцца ўсераённыя чырвоныя абозы. Пленум райвыканкому выклікаў пасьледаваць яго прыкладу ўсе раёны БССР.

Пленум заклікаў калгасьнікаў, беднякоў і сераднякоў — аднаасобнікаў — даць жорсткі адпор ўсім пыцікам, малаверам і кулацкім агентам, якія крычаць аб пераэльдасьці пляну загатовак.

Нарастае хваля чырвоных абозаў

МТС—на чале здатчыкаў

ШКЛОЎ (ПА ТЭЛЕГР.).

КАЛГАСЫ ШКЛОЎШЧЫНЫ ДА 16-ГА ЖНІЎНЯ ЗДАЛІ ЧЫРВОНЫМІ АБОЗАМІ 49 ТОН ЗБОЖА, 12 ТОН ІЛЬНАСЕНЬНЯ, 17 ТОН ІЛЬНАСАЛОМЫ І 12 ГАРОДНІНЫ. КАЛГАСЫ ВЫКАНАЛІ 50 ПРОЦ. ГАДОВАГА ПЛЯНУ ЗБОЖЖАЗАГАТОВАК.

***

КОЙДАНАВА (ПА ТЭЛЕФ.).

У ДЗЕНЬ ПЕРАДАЧЫ СЬЦЯГУ ЦК КП(б)Б КАЛГАСЫ КОЙДАНАЎСКАЙ МТС КАНВЭЕРАМ З ПАД МАЛАТАРНІ АДГРУЗІЛІ 11 ВАГОНАЎ ЗБОЖЖА. КАЛГАСАМІ ЗДАНЫ ТАКСАМА 3 ВАГОНЫ ГАРОДНІНЫ І 52 ШТ. ЖЫВЁЛЫ. КАЛГАСЬНІКІ ЗАПЭЎНЯЮЦЬ ПАРТЫЮ І ЎРАД, ШТО ЯНЫ ПЕРАВЫКАНАЮЦЬ ПЛЯНЫ ЗБОЖЖАЗАГАТОВАК.

***

ЧЫРВОНАЯ-СЛАБАДА (НАШ КАР.).

ТАНЕЖЫЦКАЯ МТС, ЧЫРВОНАСЛАБОДЗКАГА РАЁНУ АРГАНІЗАВАЛА ЧЫРВОНЫ АБОЗ СА ЗБОЖЖАМ НОВАГА ЎРАДЖАЮ ЗДАНА 112 ТОН. НАЙБОЛЬШУЮ КОЛЬКАСЬЦЬ ЗБОЖЖА ЗДАЎ КАЛГАС «МАЙСКІ ЛУЧ». РЫХТУЮЦЦА НОВЫЯ ЧЫРВОНЫЯ АБОЗЫ.

І. Н.

***

ПУХАВІЧЫ (НАШ КАР.).

КАМУНА «ЗЬВЯЗДА» ПЕРШАЯ У РАЁНЕ ЗДАЛА 12 ТОН ЗБОЖЖА, ПЕРАВЫКАНАЎШЫ НА 200 ПРОЦ. ГАДАВЫПЛЯН ЗАГАТОВАК.

Пад пагрозай перабояў

БЫХАЎ (наш кар.).

Быхаўская кантора «Саюзхлеба» забясьпечана прыёмнымі складамі толькі на 60 проц. Не хапае тары. Патрэбна каля 8.000 мяшкоў, ёсьць каля 1.900. Рад арганізацый затрымлівае тару і не здае яе «Саюзхлебу». Справа перадана пракурору для прыцягненьня да адказнасьці винаватых у затрыманьні тары, але дагэтуль канкрэтныя меры ня прыняты. Мабілізацыя вольнай тары не праведзена. Ня дана ніякіх канкрэтных указаньняў аб арганізацыі бестарнай перавозкі збожжа.

Не хапае рахункових работнікаў. Ёсьць толькі 4 прыёмшчыкі збожжа, што пагражае перабоямі ў прыёмцы збожжа на складах. Непрапрацавана пытаньне наконт адкрыцьця прыпісной касы Дзяржбанку для разьліку са здатчыкамі.

Быхаўская кантора «Саюзхлеба» павінна прыняць тэрміновыя меры, каб сустрэць загатоўкі ў бадной гастоўчасьці.

Кулакі здалі толькі 35 клг.

МАЗЫР (наш. кар.).

Мазырская партарганізацыя па-бальшавіцку ўзялася за практычнае ажыцьцяўленьне пастаноў ЦК УсеКП(б) — і ЦК КП(б)Б аб збожжазагатоўках. Высунуты сустрэчны плян загатовак, які на 200 тон перавышае кантрольныя лічбы Наркамснабу. Да 9-га жніўня чырвонымі абозамі здана 55 тон збожжа і 240 тон сена. Вядзецца падрыхтоўка да раённага чырвонага абозу. На вёскі паслана 40 чал. Камандыраваным таварышом даручна праверыць, як здаюць збожжа кулацка-заможныя элементы. Да 10-га жні.ня, кулацкія гаспадаркі здалі толькі 35 клг. Парт'ячэйкі і сельсаветы павінны ўзмацніць націск на кулацка-заможныя гаспадаркі, дабіцца поўнага выкананьня імі цьвёрдых заданьняў.

Юшкевіч.

Дуброўна не падрыхтавана да прыёму збожжа

Няма складаў для ссыпкі

ДУБРОЎНА. (Наш кар.).

Падрыхтоўка да збожжазагатовак па гаёнах праведзена выключна дрэнна. Нічога не зроблена, каб растлумачыць касьбіньніцтву значэньне загатовак. Няма складаў для ссыпкі збожжа. На зьбіральцы тара. Патаемныя гандляры — прыватнікі карыстаюцца дрэннай падрыхтоўкай, ёсьць выпадкі продажу збожжа новага ўраджаю на прыватным рынку.

Ня гледзячы на тое, што мапацьба ўжо скончана, здача лішкаў калгасамі яшчэ не арганізавана. Пытаньне аб збожжазагатоўках не абгаварвалася на пленумах сельсаветаў. Камісіі садзейнасьці збожжазагатоўкам амаль ні дзе не арганізаваны. Дрэнна праведзена работа па давядзеньні цьвёрдых заданьняў да кулацка-заможных гаспадарак.

Агульны вывад — Дуброўенскі раён не падрыхтаваны да сустрэчы збожжа. Трэба зараз-жа павярнуць усе арганізацыі тварам да загатовак збожжа.

Чарняўскі.

У ПЕРШАЙ ПАЛОВЕ БЯГУЧАГА ГОДУ ЛКСМБ ПРЫНЯЎ У СВАЕ РАДЫ ТОЛЬКІ 34 ТЫСЯЧЫ ЧАЛАВЕК. ДЗЕСЯТКІ ТЫСЯЧ РАБОЧЫХ І СОТНІ ТЫСЯЧ КАЛГАСНАЙ МОЛАДЗІ ЯШЧЭ ПА-ЗА КАМСАМОЛАМ

Умацоўваць парткіраўніцтва работай ячэек ЛКСМБ, шырэй разгортваць змаганьне за новыя атрады камсамолу

У барацьбе за ажыцьцяўленьне задач сацыялістычнага будаўніцтва, пад непасрэдным кіраўніцтвам камуністычнай партыі, чырвонасьцяжны ленінскі камсамол нябывала вырас, як ідэалёгічна, так і арганізацыйна. IX зьезд УсеЛКСМ выходзячы з далейшых задач разгорнутага сацыялістычнага будаўніцтва і павышэньня ролі камсамольскай арганізацыі, высунуў гістарычны лёзунг — П�ЕРАТВАРЫЦЬ ЛЕНІНСКІ КАМСАМОЛ У ШМАТМІЛЬЁННУЮ АРГАНІЗАЦЫЮ. З часу IX-га зьезду УсеЛКСМ прайшло 7 месяцаў. І мы сёньня ў праве паставіць пытаньне: — як-жа камсамол Беларусі практычна ажыцьцяўляе гэты лёзунг IX-га зьезду Усесаюзнага камсамолу? Пастаноўка гэтага пытаньня набывае асаблівае вялікае значэньне іменна зараз, калі ўся камсамольская арганізацыя рыхтуецца да правядзеньня 17-га МЮД'у.

За перыяд з 1 студзеня (г. зн. ад X-га зьезду ЛКСМБ) да 15 лютага г. г. было ПРЫНЯТА Ў КАМСАМОЛ БЕЛАРУСІ 34.000 ЧАЛАВЕК, у той час, як за апошнія два з паловай гады было прынята толькі 50.000 чалавек. Аднак, калі ўлічыць нябывалае пашырэньне базы росту ў сувязі з шпаркімі тэмпамі сацыялістычнага будаўніцтва, дык гэты рост, які мы мелі ў бягучым годзе, трэба прызнаць слабым. ЛІПЕНЬСКІ КАНТРОЛЬНЫ ПЛЕНУМ ЦК ЛКСМБ, ПАДКРЭСЬЛІВАЮЧЫ НЕЗДАВАЛЬНЯЮЧЫ РОСТ ЛКСМБ папярэдзіў усе арганізацыі аб неабходнасьці ўзмацненьня вярбовачнай работы. Тая база росту, якая ў нас у Беларусі, ёсьць, павінна быць у максымальнай меры скарыстана для папаўненьня камсамольскіх радоў. Рабочая моладзь па Беларусі ахоплена камсамолам толькі на 41,7 проц., а фабзавучнікі на 70,1 проц. На 1 ліпеня больш 25.000 рабочай моладзі (акрамя Транспартнікаў, сельска-гаспадарчых рабочых і батракоў) было па-за камсамолам. Па-за камсамолам знаходзіцца і капя 6.000 вучняў ФЗВ і больш 300.000 калгаснай моладзі.

У чым прычыны неўстарчальнага росту камсамольскай арганізацыі Беларусі, дзе прычыны таго, што тысячы рабочай моладзі, тысячы вучняў ФЗВ, батракоў і с.-г. рабочых знаходзяцца яшчэ па-за камсамолам?

Па-першае, прычына заключаецца ў тым, што рад раённых кіруючых органаў камсамольскай арганізацыі бялявую работу па вярбоўцы рабочай моладзі ў камсамол падмяняюць апартуністычнай стаўкай на самацёк. Рад камсамольскіх арганізацый і калектываў ня здолелі ўвязаць змаганьня за рост камсамолу з актыўным удзелам у сацыялістычным будаўніцтве. Частка арганізацый ЛКСМБ не прапрацавала пастаноў апошніх зьездаў камсамолу, не давяла іх да шырокіх камсамольскіх мас і мас рабочай моладзі.

Рад раённых камсамольскіх арганізацый НЕЎРАЗУМЕЛІ палітычнай важнасьці лёзунгу пераўтварэньня камсамолу ў шматмільённую арганізацыю і таму няправільна арыентавалі камсамольскія масы на яго рэалізацыю. ТУРАЎСКІ РАЙКОМ КАМСАМОЛУ ў сваёй пастанове запісаў пітэральна наступнае: «скарыстаць час прапрацоўкі пастаноў зьезду для ўзмацненьня росту камсамольскай арганізацыі за лік батрацкай, бядняцкай перадавой калгаснай моладзі і лепшай часткі сераднякоў-аднаасобнікаў». Гэта ўяўна супярэчыць пастановам зьезду. Батракоў мы павінны ахапіць камсамолам на ўсе 100 проц., а лепшую частку калгаснай моладзі ні ў якім разе нельга ставіць побач да беднякоў і сераднякоў — аднаасобнікаў. Няправільна арыентаваў камсамольскую арганізацыю і АРШАНСКІ РАЙКОМ камсамолу. Ён даў дырэктыву камсамольскім ячэйкам у першую чаргу прымаць батрацка-бядняцкую моладзь, а потым ужо калгасную.

У сувязі з няправільнай арыентацыяй арганізацыі з боку РК на будаўніцтве Аршанскага ЧСУ, дзе больш як 1.000 чалавек моладзі, у камсамол прынята толькі 58 чалавек. Каля паўтысячы чалавек рабочай моладзі камсамольскага ўзросту не завербавана ў ЛКСМБ і на АСІПОВІЦКІМ ЧЫГУНАЧНЫМ ВУЗЬЛЕ. З 800 чалавек рабочай моладзі Магілеўскай шэйнай фабрыкі на 5-га жніўня ў камсамоле было толькі 200 чалавек. Недапушчальна едстае ў росьце і фабзавуч заводу імя Сталіна. ХОЦІМСКАЯ арганізацыя за 5 месяцаў прыняла ў камсамол толькі 44 чалавекі. У той час, калі гэты раён моў самы большы процант капектывізацыі ў БССР, там ня створана ніводнай камсамольскай ячэйкі ў калгасе. Дырэктыва зьезду аб тым, што ў кожным калгасе павінна быць камсамольская ячэйка, Хоцімскай арганізацыяй ня выканана.

СЛАБА РАЗГОРНУТА РАБОТА ПА ВЯРБОЎЦЫ РАБОЧАЙ МОЛАДЗІ Ў КАМСАМОЛ І НА ТОРФАЗАВОДАХ. На Вульскім торфазаводзе моладзі 300 чалавек, а камсамольцаў — 30, на Грэбянеўскім моладзі 560, камсамольцаў — 65, на Чашніцкім моладзі 400, камсамольцаў 37 і г. д.

Ня гледзячы на гэтыя асобныя факты недапушчальнага слабога разгортваньня работы па вярбоўцы ў камсамол рабочай і батрацкай моладзі, усё-ж КРЫВАЯ РОСТУ КАМСАМОЛУ ПАСТУПОВА ІДЗЕ ЎВЕРХ. Аб гэтым выразна гавораць лічбы прыёму першага і другога кварталаў б. г. З КОЖНЫМ МЕСЯЦАМ ТЭМПЫ РОСТУ ЛКСМБ НАРАСТАЮЦЬ. РАД ПРАДПРЫЕМСТВАЎ («Камунар», «Полымя рэвалюцыі», «Пралетары», «Рухавік рэвалюцыі», ФЗВ «КІМ», ФЗВ фабрыкі «Дзьвіна»), ШМАТ ЦЭХАЎ, БРЫГАД І АГРЭГАТАЎ ІНШЫХ ПРАДПРЫЕМСТВАЎ У АСНОЎНЫМ АКАМСАМОЛЕНЫ.

Некаторыя раённыя камсамольскія арганізацыі далі сапраўды бялявыя ўзоры работы. ПЛЕШЧАНІЦКІ РАЙКОМ КАМСАМОЛУ арганізаваў агітацыйна-масавы рэйд за ўвядзеньне зьдзяльшчыны ў калгасах, умела злучыўшы гэту работу з арганізацыяй камсамольскіх ячэек у кожным калгасе. У рэзультаце рэйду ЗАВЯРБАВАНА Ў КАМСАМОЛ 145 ЧАЛАВЕК РАБОЧЫХ, БАТРАКОЎ І ПЕРАДАВОЙ КАЛГАСНАЙ МОЛАДЗІ І АКАМСАМОЛЕН САУГАС «ЗАМОШША». ШЫРКАЎСКАЯ ЯЧЭЙКА ЛКСМБ (Мсьціслаўскі раён) арганізавала 5 ЯЧЭЕК у калгасах. Волацкая ячэйкай (Хойніцкі раён) арганізавана 3 НОВЫЯ ЯЧЭЙКІ. Прычым, гэта работа па арганізацыі ячэек, па вярбоўцы лепшай калгаснай моладзі ў камсамол, увязвалася з павышэньнем ролі камсамолу і калгаснай моладзі ва ўборцы ўраджая.

Рад камсамольскіх калектываў на фабрыках і заводах сваю работу па вярбоўцы ў ЛКСМБ рабочай моладзі ўмела злучылі з павышэньнем тэмпаў змаганьня за выкананьне прамфінпляну, за вуладаньне тэхнікай. НА ЗАВОДЗЕ «КАМУНАР» ліцейны цэх ня выканаў свой прамфінплян. У ЛІПЕНІ-Ж МЕСЯЦЫ, ПАСЬЛЯ АКАМСАМОЛЕНЬНЯ, ЦЭХ ВЫКАНАЎ ПЛЯН НА 105 ПРОЦ. Камсамольскі калектыў ФАБРЫКІ «КАСТРЫЧНІК» завербаваў у камсамол 200 чалавек. Прыём новых камсамольцаў быў увязан з мабілізацыяй рабочай моладзі на піквідацыю прарыву ў выкананьні прамфінпляну.

Нельга не паказаць і на рад грубых скажэньняў палітыкі росту. Рад камсамольскіх арганізацый ажыцьцяўленьне лёзунгу аб пераўтварэньні камсамолу ў шматмільённую арганізацыю зразумелі, як самамэту, не ўвязалі вярбовачнай работы са змаганьнем за ажыцьцяўленьне асноўных палітычна-гаспадарчых задач партыі, ПАДМЯНІЛІ ДЗЕЛАВУЮ СЫСТЭМАТЫЧНУЮ РАБОТУ СЯРОД МОЛАДЗІ ПАГОНЯЙ ЗА ГОЛАЙ ЛІЧБАЙ. На скарняжнай фабрыцы падыйшлі да пытаньня вярбоўкі ў камсамол рабочай моладзі фармальна. Там раздавалі анкеты, не правяўшы масавай работы, не растлумачыўшы сутнасьці і значэньня важнейшага лёзунгу камсамолу. Фармальна падыйшлі і на «Камунарцы». Там запаўнялі на моладзь анкеты, мэханічна прымалі ў камсамол і выпісвалі камсамольскія білеты. Былі выпадкі, калі гэтыя мэханічна-прынятыя адмаўляліся атрымаць білеты. АБУРАЮЧЫ ФАКТ ПАГОНІ ЗА ГОЛАЙ ЛІЧБАЙ МЫ МАЕМ У СТАРА-ДАРОСКІМ РАЁНЕ. Там Пасіцкая ячэйка прыняла ў камсамол 3-х кулакоў.

Слабы рост асобных камсамольскіх арганізацый, моманты грубых скажэньняў лёзунгу пераўтварэньня камсамольскай арганізацыі ў шматмільённую зьявіліся рэзультатам зусім слабога партыйнага кіраўніцтва камсамолам з боку раду партячэек. Іменна таму, што некаторыя партыйныя ячэйкі і нават раённыя арганізацыі КП(б)Б слаба кіруюць работай камсамолу, мяюць месца тыя прарывы, аб якіх мы казалі вышэй. Рад кіруючых партрабінкаў яўна недаацэньваюць значэньня росту камсамолу за кошт рабочай моладзі і вярбоўку ў партыю перадавых камсамольцаў-ударнікаў. Аб гэтым выразна гавораць лічбы. ЗА ЛІПЕНЬ МЕСЯЦ ПЕРАДАДЗЕНА Ў ПАРТЫЮ ТОЛЬКІ 160 ЧАЛАВЕК КАМСАМОЛЬЦАЎ, ШТО СКЛАДАЕ Ў АДНОСНАХ ДА РОСТУ КСМ ТОЛЬКІ 1,4 ПРОЦ. Замест павялічэньня наглядаецца некаторае зьніжэньне партыйнага асяродку ў камсамоле. КАЛІ НА 1 СТУДЗЕНЯ Б. Г. ПАРТАСЯРОДАК У КАМСАМОЛЕ РАЎНЯЎСЯ 7,8 ПРОЦ., ДЫК НА 1 ЛІПЕНЯ ЁН РОВЕН ТОЛЬКІ 6,8 ПРОЦ.

РАБОТА ПА ПЕРАТВАРЭНЬНІ КАМСАМОЛУ Ў ШМАТМІЛЬЁННУЮ АРГАНІЗАЦЫЮ ПАВІННА БЫЦЬ ПАДНАЧАЛЕНА ЗАДАЧАМ ПАВЫШЭНЬНЯ РОЛІ КАМСАМОЛУ Ў БАРАЦЬБЕ ЗА ВЫКАНАНЬНЕ ЗАДАЧ ТРЭЦЯГА РАШАЮЧАГА ГОДУ ПЯЦІГОДКІ. Практыч на ў нашых умовах гэта значыць: — пікідаваць прарыў на торфараспрацоўках, на ільнаапрацоўчых заводах, шэфам якіх зьяўляецца ленінскі камсамол, павысіць змаганьне за выкананьне і перавыкананьне прамфінпляну, да 17-га МЮД'у ахапіць 100-проц. усёй рабочай моладзі сацыялістычным спаборніцтвам і ўдарніцтвам, пікідаваць абязьлічку, змагацца за перавядзеньне цэхаў на гаспадарчы разрахунак, няўхільна паляпшаць культурна-бытавыя ўмовы. Вясковыя арганізацыі камсамолу павінны пікідаваць прарывы ва ўборцы ўраджаю, асабліва тэхнічных культур, у сіласаваньні, у разгортваньні сацыялістычнай жывёлагадоўлі, павінны ўсе сілы накіраваць на арганізацыйнае і гаспадарчае замацаваньне калгасу, на падрыхтоўку да асеньняй сяўбы.

Ленінскі камсамол Беларусі гэтыя задачы выканае з посьпехам толькі пры тай умове, калі партыйныя ячэйкі ЎЗМОЦНЯЦЬ сваё кіраўніцтва работай ячэек ЛКСМБ, калі перабудуюць работу камсамольскіх арганізацый у адпаведнасьці з тымі палітычнымі задачамі, якія паставіла партыя.

С. АНІСАЎ.

КАДРЫ

„Пашлеце лепшых ударнікаў на вучобу ў школу Прафруху"

Усім фабрычна-заводзкім арганізацыям, усім рабочым БССР

У той час, калі капіталістычны сьвет перажывае востры знакамічны крызіс і беспрацоўньня напіхваюцца дзесяткамі мільёнаў (40 млн.), Савецкі Саюз, пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі, шпаркімі тэмпамі ідзе да пабудовы сацыялізму.

У трэцім рашаючым годзе ўступаюць у строй 518 новых заводаў-гігантаў і 1.040 машына-трактарных станцый. Расьце і мацнее саўгасна-калгаснае будаўніцтва. Расьце рабочая кляса. Толькі за адзін 1931 год армія рабочых павялічваецца на два мільёны. Растуць і кадры арганізатараў рабочай клясы. «Ініцыятары сацспаборніцтва, правадыры ўдарных брыгад, практычныя натхніцелі працоўнага ўзьліму, арганізатары работ на тых ці іншых вучастках будаўніцтва — вось новыя праслойкі рабочай клясы» (Сталін).

Прафсаюзы, як школа камунізму, ставяць сваёй задачэй клясава-палітычнае, культурнае і вытворчае выхаваньне рабочай клясы. Гэта задача асабліва павялічваецца ў пэрыяд шпаркага росту сацыялістычнай гаспадаркі і рабочай клясы. Адзін з мэтадаў узьняцьця культурна-палітычнага ўзроўню мас, — гэта пашырэньне школ партыйных, прафсаюзных тэхніч.ных і г. д., дзе пры дапамозе марксыцка-ленінскай мэтадалёгіі выхоўваюцца бальшавіцкія кіруючыя кадры.

У 1929 годзе пры ЦСПСБ арганізавалася рэспубліканская школа прафруху. Гэта школа выхоўвае прафсаюзныя кадры. У 1929-30 годзе было выпушчана 119 чалавек, у 1930-31 годзе выпускаецца 140 чалавек на прафсаюзную кіруючую работу.

Рэканструкцыя прамысловасьці і сельскай гаспадаркі ставяць перад прафсаюзнымі арганізацыямі задачу яшчэ большага павялічэньня колькасьці і якасьці прафсаюзных кадраў. Гэтыя кадры павінны быць набраны з лепшых ударнікаў вытворчасьці і саўгасаў, з людзей здольных праводзіць генэральную лінію партыі ў прафруху. Паводле пляну 1931-32 г. рэспубліканская школа прафруху мяркуе прапусьціць праз школу 400 асоб.

Вэш завод павінен выканаць разьвёрстку ЦСПСБ па вылучэньні ЛЕПШЫХ УДАРНІКАЎ НА ВУЧОБУ У РЭСПУБЛІКАНСКУЮ ШКОЛУ ПРАФРУХУ. Мы просім калектыў рабочых, партыйную і прафсаюзную арганізацыі заводу ЗЬВЯРНУЦЬ АСАБЛІВУЮ УВАГУ НА ПАДБОР ГЭТЫХ ТАВАРЫШОЎ, памятаючы аб тым, што кожны з пасланых таварышоў павінен стаць у будучым кіраўніком асобных прафсаюзных арганізацый ад ФЗМК да РПС і ЦП.

АБГАВАРЭЦЬ КАНДЫДАТУРЫ НА АГУЛЬНЫХ РАБОЧЫХ СХОДАХ, падбярэце найбольш здольных, палітычна вытрыманых, прыкладных на вытворчасьці, якія выявілі себе як гракадзкай рабоце, як арганізатары мас. Гэта забясьпечыць нам магчымасьць даць прафсаюзнаму руху БССР новы струмень рабочых-ударнікаў, кіраўнікоў прафруху.

З пралетарскім прывітаньнем:
ЦСПСБ, МЕНГАРПРАФСАВЕТ, БЮРО ПАРТКАЛЕКТЫВУ, ДЫРЭКЦЫЯ, СТУДКОМ ШКОЛЫ.

ПАРТЫЙНАЕ БУДАЎНІЦТВА

Барацьба за торф

УЗЬНЯЦЬ ТЭМП торфаздабычы

ВЫКАНАНЬНЕ СЕЗОННАГА ПЛЯНУ ТОРФАЗДАБЫЧЫ (У ПРОЦ.)

9 ЖНІЎНЯ	12 ЖНІЎНЯ
40,2	41,8
10 ЖНІЎНЯ	**13 ЖНІЎНЯ**
40,9	42,3
11 ЖНІЎНЯ	**14 ЖНІЎНЯ**
41,3	42,8

НА ТАРФЯНЫМ ФРОНЦЕ НЯМА НІЯКІХ ЗЬМЕН. ТОРФАЗДАБЫЧА НАРАСТАЕ НІКУДЫ НЯГОДНЫМІ ТЭМПАМІ. ФАКТЫЧНА ЗА АПОШНЮЮ ПЯЦІДНЕЎКУ ЯНА СТАЩЬ НА АДНЫМ УЗРОЎНІ. У СЯРЭДНІМ ЗА ДЗЕНЬ ТОРФАПРАМЫСЛОВАСЬЦЬ ДАЕ ПРЫРОСТ У ВЫКАНАНЬНІ СЭЗОННАГА ПЛЯНУ НЯ БОЛЬШ, ЧЫМ НА 0,5 ПРОЦ.

НА 14 ЖНІЎНЯ СЭЗОННЫ ПЛЯН ТОРФАЗДАБЫЧЫ ВЫКАНАЎ НА 42,8 ПРОЦ. ПААСОБНЫЯ ЗАВОДЫ БЕЛТОРФУ ЗА ГЭТЫ ДЗЕНЬ ДАБІЛІСЯ ПЕРАВЫКАНАНЬНЯ СВАІХ ДЗЕННЫХ ЗАДАНЬНЯЎ. ПЕРШЫМ ПА ВЫКАНАНЬНІ ДЗЕННАГА ЗАДАНЬНЯ І СЭЗОННАГА ПЛЯНУ ІДЗЕ ЗАВОД «ЧЫРВОНЫ ТАРФЯНІК».

«ЧЫРВОНЫ ТАРФЯНІК» 14 ЖНІЎНЯ ВЫКАНАЎ ДЗЕННАЕ ЗАДАНЬНЕНА 118,7 ПРОЦ. ЗАВОД ІШЧЫЛЬНА ПАДЫШОЎ ДА ПОЎНАГА ВЫКАНАНЬНЯ СЭЗОННАГА ПЛЯНУ (92 ПРОЦ.).

ЗАВОД «БАЛЬШАВІК» ВЫКАНАЎ ДЗЕННАЕ ЗАДАНЬНЕ 14 ЖНІЎНЯ НА 111,4 ПРОЦ.

ГАНЕБНЕЙШЫЯ ПАКАЗАЛЬНІКІ ДАЛІ ТОРФАЗАВОДЫ «КАЛЕКТЫЎНАЯ ПРАЦА» (10,8 ПРОЦ. ДЗЕННАГА ЗАДАНЬНЯ), «СМАЛЯВІЧЫ» (5,0 ПРОЦ.), «РЭМІЗАВА» (10,1 ПРОЦ.), ІМЯ ДАУМАНА (32 ПРОЦ.), «ВЯЛІКІ МОХ» (23,8 ПРОЦ.), «СВАБОДА» (19,4 ПРОЦ.), «ВОЛЬНІЦА» (13,3 ПРОЦ.), ІМЯ ПЕРШАГА МАЯ (27,3 ПРОЦ.).

ЗНАЧНА ПАДЦЯГНУЎСЯ ЗАВОД «ЛЕНІНСКІ ШЛЯХ», ЯКІ ЎЖО ВЫКАНАЎ СВАЕ СЭЗОННАЕ ЗАДАНЬНЕ НА 82,2 ПРОЦ.

ЯК І РАНЕЙ ЗУСІМ ДРЭННА ПРАЦУЕ АСІНТОРФ, ЯКІ ВЫКАНАЎ 14 ЖНІЎНЯ СВАЕ ДЗЕННАЕ ЗАДАНЬНЕ ТОЛЬКІ НА 44,3 ПРОЦ. СЭЗОННАЕ ЗАДАНЬНЕ АСІНТОРФ НА 14 ЖНІЎНЯ ВЫКАНАЎ УСЯГО ТОЛЬКІ НА 47,1 ПРОЦ.

КАРЭНЬНІ ТАКОГА СТАНОВІШЧА ЗАКЛЮЧАЮЦЦА Ў ТЫМ, ШТО ПАРТЫЙНЫЯ І ПРАФСАЮЗНЫЯ АРГАНІЗАЦЫІ ТОРФАЗАВОДАЎ, ЗА ПААСОБНЫМІ ВЫКЛЮЧЭНЬНЯМІ, ЯШЧЭ НЕ РАЗГАРНУЛІ САПРАЎДНАЙ БАЛЬШАВІЦКАЙ БАРАЦЬБЫ ЗА ТОРФ. НА ТОРФАЗАВОДАХ АБЯЗЬЛІЧКА І ЎРАЎНІЛАЎКА ЯШЧЭ НЕ ЛІКВІДАВАНЫ. ПРАДПРЫЕМСТВЫ НЕ ПЕРАВЕДЗЕНЫ НА ГАСПАДАРЧЫ РАЗРАХУНАК. ВОПЫТУ ЛЕПШЫХ БРЫГАД ТАРФЯНІКАЎ, ПАКАЗАЎШЫХ САПРАЎДЫ ГЕРАІЧНЫЯ ТЭМПЫ Ў БАРАЦЬБЕ ЗА ТОРФ, НЕ ПЕРАНЕСЬЛІ НА ЎСЕ ПРАДПРЫЕМСТВЫ ТАРФЯНОЙ ПРАМЫСЛОВАСЬЦІ.

СЭЗОН ТОРФАЗДАБЫЧЫ ПРАЦЯГНУТ. У НАШЫМ РАСПАРАДЖЭНЬНІ ЯШЧЭ ЕСЬЦЬ ЧАС ДЛЯ ТАГО, КАБ ДАБІЦЦА РАШАЮЧАГА ПЕРАЛОМУ Ў ВЫКАНАНЬНІ СЭЗОННАГА ПЛЯНУ. ЗАДАЧА ПАРТЫЙНЫХ І ПРАФСАЮЗНЫХ АРГАНІЗАЦЫЙ ЗАКЛЮЧАЕЦЦА Ў ТЫМ, КАБ НА АСНОВЕ РЭАЛІЗАЦЫІ ПАСТАНОВЫ ЦК І СНК СССР АБ ТОРФАРАСПРАЦОЎКАХ САПРАЎДЫ МАБІЛІЗАВАЦЬ ТАРФЯНІКОЎ НА БАРАЦЬБУ ЗА ТОРФ.

ЗАВОДЫ — СПАЖЫЎЦЫ ТОРФУ — ПАВІННЫ ВЫКАНАЦЬ СВАЮ АБАВЯЗКІ ПЕРАД ТАРФЯНОЙ ПРАМЫСЛОВАСЬЦЮ І ДАПАМАГЧЫ ЗАВОДАМ БЕЛТОРФУ ПОЎНАСЬЦЮ АЖЫЦЬЦЯВІЦЬ СВАЮ ПРАГРАМУ.

ДАЛЕЙШАЯ МАРУДНАСЬЦЬ, ДАЛЕЙШЫЯ ПАВОЛЬНЫЯ ТЭМПЫ РАБОТЫ — НЕДАПУШЧАЛЬНЫ

ТРАНСПАРТ

Станцыя здарэньняў...

На ст. Старушка здарэньні ня спыняюцца

Неадкладна аздаравіць склад работнікаў станцыі

Зьвязда» ў свой час ужо сыгналізавала аб агіднай рабоце станцыі Старушкі Зах. чыгункі. У допісах прыводзіўся рад злачынных фактаў з боку адміністрацыі гэтай станцыі.

Па зьмешчаных допісах выяжджала камісія для расьсьледаваньня.

Вынікі работы камісіі яшчэ невядомы, але адно вядома, што ўвесь склад работнікаў станцыі Старушкі застаўся на сваіх мясцох і па-ранейшаму там існуе бязьдзейнасьць. Праз некалькі дзён пасьля ад'езду камісіі адбылося чарговае здарэньне. 1 жніўня ў 6 гадз. вечара па Пастолаўскай ветцы на 21-м кілёмэтры быў пушчан паравоз Захчыхбуду, у той час, як паравоз Пастолаўскага лесправгасу таксама курсаваў па гэтай ветцы. Аб гэтым адміністрацыя Пасталоўскай веткі зусім ня была папярэджана.

3 жніўня паравоз Пасталоўскага лесправгасу сталу на парах і чакаў адпраўкі на станцыю Старушкі. Адміністрацыя чыгункі зноў бяз усякага папярэджаньня накіравала сустрэчны паравоз і на 21 кілёмэтры адбылося скрыжаваньне гэтых паравозаў.

Дзякуючы гэтага, трэба адзначыць, што паравозы пускаюцца без правалнікоў і захаваньня элементарных правіл чыгуначнага руху. Так, напрыклад, выпадзеньні паравозы разьвівали хуткасьць 50 клм. у гадзіну, у той час, як інспекцыяй чыгункі на гэтай ветцы дазволена разьвіваць хуткасьць толькі 18 клм. у гадзіну.

Рабкораўская брыгада «Зьвязды» і Пасталоўскага лесправгасу патрабуюць раз назаўсёды рашуча аздаровіць працу станцыі Старушкі.

Пажарнай ахове прадпрыемстваў максымум увагі

Пажары на фабрыках і заводах б'юць па магутнасьці прамысловасьці, марудзяць рост сацыялістычнага будаўніцтва. Таму прафілактычныя меры барацьбы супроць агня на вытворчасьці маюць вялізарнае значэньне і датычаць ня толькі пажарных арганізацый, але і ўсіх заводзкіх арганізацый і ўсіх рабочых.

За мінулы год (ліпень 1930 г.—ліпень 1931 г.) было 110 выпадкаў падпалаў і пажараў, з іх 4 буйных пажары, якія далі вялікія страты вытворчасьці.

Лічбы сьведчаць аб тым, што агнявая небясьпека на прадпрыемствах зьяўляецца сур'ёзнай небясьпекай. У барацьбе з ёй трэба прыняць усе меры папярэджаньня.

Ці добра стаіць справа з аховай прамысловасьці ад агня. Не, ня зусім. Мы сустракаем рад злачынных недахопаў у пастаноўцы справы аховы прадпрыемства ад агня.

Трэба рашуча ўдарыць па пядбайных адносінах да справы пажарнай аховы, шырока разьвіць самакрытыку на выяўленьні слабых месц у пажарнай справе, разьвіваць ударніцтва і сацспаборніцтва па пажарных мерапрыемствах, мабілізаваць шырокія масы вакол пытаньняў барацьбы з агнявой небясьпекай, асьвятляць на старонках друку ўсе недахопы і станоўчыя рэзультаты барацьбы. Трэба ўзяць пад жорсткі кантроль рабочых справу пажарнай аховы. Толькі пры ўдзеле ўсяго рабочае клясы ў барацьбе з агнявой небясьпекай мы можам дасягнуць поўнага посьпеху ў ахове прадпрыемства ад агня.

Добраахвотныя дружыны прафкамы, якія арганізуюцца з рабочых, павінны быць акружаны ўвагай мясцовых арганізацый.

Партыйныя і прафарганізацыі павінны заслухоўваць інфармацыі аб пастаноўцы аховы прадпрыемства ад агня і агульнай ахове прадпрыемства.

Ад адміністрацыі патрабуецца максымум увагі выкананьню супроць-пажарных мерапрыемстваў і агульнай ахове прадпрыемства. Больш увагі ахове прадпрыемстваў!

Леанарда.

Буйнейшыя прадпрыемствы —пад нагляд НКАЗ

Народны Камісарыят Аховы Здароўя бярэ пад свой сталы, непасрэдны нагляд буйнейшыя прадпрыемствы БССР з мэтай практычнага ажыцьцяўленьня на іх санітарна-гігіенічных мерапрыемстваў і аздараўленчай работы.

У Менску бярэцца пад нагляд наступныя пр

КРОУ СТЫНЕ У ЖЫЛАХ...

ПАУГОЛЫХ ЖАНЧЫН ТУРЭМНЫЯ КАТЫ ПІНСКУ ЦЯГАЛІ ЗА ВАЛАСЫ

ЗЬБІВАЛІ ДА КРЫВІ І ПОТЫМ КІДАЛІ У КАРЦЭР, НАПОУНЕНЫ ВАДОЙ

КАТАВАНЬНІ У ПІНСКАЙ ТУРМЕ—ШТОДЗЕННАЕ ЗЬЯВІШЧА

Палітзьняволеныя проста гінуць

ДАКУМАНТ КРЫВІ І БАРБАРСТВА

Год выданьня—XV
№ 224 (4129)
СРЕДА 19 ЖНІЎНЯ 1931
Цана нумара 5 кап.
выходзіць БЕСЬПЕРАПЫННА

ЗЬВЯЗДА

Орган ЦК Мен. Гаркому Камуністычнай партыі (б) Беларусі.

(Ліст з Пінскага засьценку)

ДАРАГІЯ ТАВАРЫШЫ!

МУСІЦЕ ШТОСЬЦІ ПРАДПРЫНЯЦЬ, КАБ ВЫРАТАВАЦЬ НАШЫХ ТАВАРЫШОЎ, ЯКІЯ ЗНАХОДЗЯЦЦА Ў ПІНСКАЙ ТУРМЕ. ПАТРЭБНА НЕАДКЛАДНАЯ КАМПАНІЯ, БО ПАЛІТЫЧНЫЯ ЗЬНЯВОЛЕНЫЯ ПРОСТА ГІНУЦЬ ТАМ З ПРЫЧЫНЫ НЯЛЮДЗКАГА АБЫХОДЖАНЬНЯ З ІМІ ФАШЫСЦКАЙ ТУРЭМНАЙ АДМІНІСТРАЦЫІ. ПАСЬЛЯ БАРБАРСКАЙ ЛІКВІДАЦЫІ СЯМІДЗЕННАЙ ГАЛАДОЎКІ АЖ ДА СЁНЕШНЯГА ДНЯ ПАЛІТЫЧНЫЯ ЗЬНЯВОЛЕНЫЯ Ў ПІНСКУ СЫСТЭМАТЫЧНА КАТУЮЦЦА. ЗЬБІВАНЬНЕ ПАЛІТЫЧНЫХ ЗЬНЯВОЛЕНЫХ СТАЛА ШТОДЗЕННЫМ ЗЬЯВІШЧАМ. ЗЬБІВАЕ САМ НАЧАЛЬНІК ТУРМЫ, —КАТ КОПЕЦ (КАТ З ТУРМЫ «СВ. КРЫЖА», ЗЬБІВАЮЦЬ ТУРЭМНЫЯ НАГЛЯДАЛЬНІКІ І КРЫМІНАЛЬНЫЯ, ЯКІМ АДМІНІСТРАЦЫЯ ВЫДАЕ СПЭЦЫЯЛЬНУЮ ЎЗНАГАРОДУ ПРАДУКТАМІ ЗА КОЖНУЮ ТАКУЮ «НАВУКУ», ДАНУЮ «ПАЛІТЫКАМ». ПАСЬЛЯ ЛІКВІДАЦЫІ ГАЛАДОЎКІ Ў ЛІСТАПАДЗЕ МІНУЛАГА ГОДУ ГРУПУ АКТЫЎНЫХ ПАЛІТЫЗНЯВОЛЕНЫХ ВЫВЕЗЬЛІ Ў СЕДЛЕЦКУЮ ТУРМУ. АДНАК, У ПІНСКУ ПАСТАЯННА ЗНАХОДЗІЦЦА 50-60 ПАЛІТЫЗНЯВОЛЕНЫХ, ЯКІЯ ЖЫВУЦЬ Ў ЖУДАСНЫХ УМОВАХ. ЯНЫ ЦЕРПЯЦЬ ТАМ НЕЧАЛАВЕЧЫЯ МУКІ, АД ЯКІХ КРОЎ СТЫНЕ Ў ЖЫЛАХ. ПАДАЕМ ВАМ ТУТ ФАКТЫ, ЯКІЯ СЬВЕДЧАЦЬ АБ ЖУДАСНЫХ КАТАВАНЬНЯХ ПАЛІТЫЗНЯВОЛЕНЫХ У ГЭТАЙ ТУРМЕ.

12 ЛІСТАПАДА МІНУЛАГА ГОДУ, КАЛЯ 30 ПАЛІТЫЗНЯВОЛЕНЫХ (НОВАПРЫСЛАНЫХ) СІЛАЮ БЫЛІ АСТРЫЖАНЫ І ПЕРААПРАНУТЫ Ў ТУРЭМНУЮ ВОПРАТКУ. 6 ПАЛІТЫЗНЯВОЛЕНЫХ ЖАНЧЫН БЫЛІ ПАСАДЖАНЫ Ў КАМЭРЫ ДА ПРАСТЫТУТАК. У АДКАЗ НА ГЭТА ПАЧАЛІ МЫ ГАЛАДОЎКУ. НА ДРУГІ ДЗЕНЬ ГАЛАДОЎКІ АДМІНІСТРАЦЫЯ ПАЧАЛА ШТУЧНАЕ КАРМЛЕНЬНЕ. У КАМЭРЫ ДА ЖАНЧЫН НА ЧАЛЕ З НАЧАЛЬНІКАМ ТУРМЫ КОПЕЦАМ УВАР ВАЛАСЯ БАНДА НАГЛЯДАЛЬНІКАЎ І ПАЧАЛА ІХ КАТАВАЦЬ. АМАЛЬ ГОЛЫХ, ЗА ВАЛАСЫ ЦЯГАЛІ ІХ ДА ЎБОРНАЙ, ДЗЕ ДА КРЫВІ ЗЬБІВАЛІ І ЗАМЫКАЛІ НА ЦЭЛЫЯ СУТКІ. ПЕРАД ГЭТЫМ ЎБОРНАЯ БЫЛА НАПОЎНЕНА ВАДОЮ. НА ПРАЦЯГУ СУТАК, НАГЛЯДАЛЬНІКІ НЕКАЛЬКІ РАЗ ПРЫХОДЗІЛІ І ЗЬБІВАЛІ ІХ БЯЗЬЛІТАСНА. АСАБЛІВА ЛЮТАВАЎ НАГЛЯДАЛЬНІК ДЗЯНГОЎСКІ. ДА СТРАТЫ ПРЫТОМНАСЬЦІ БЫЛІ ЗБІТЫ: Е. ДОЎГАПЯТА, Ф. РОЗЭНБАЎМ Д. ПРАШКІНОВА, ЯЕ СЯСТРА ЗЭЙЛЯ, М. ШАПІРА І Л. ПУРЫМ.

НА ДРУГІ ДЗЕНЬ ГАЛАДОЎКІ, КАЛЯ 15 СТАРЫХ ПАЛІТЫЗНЯВОЛЕНЫХ БЫЛІ КІНУТЫ Ў КАРЦЭРЫ, ДЗЕ ЗНАХОДЗІЛІСЯ 5 ДЗЁН. У ГЭТЫ-Ж САМЫ ДЗЕНЬ, ПАСЬЛЯ КАТАВАНЬНЯ ЖАНЧЫН У КАМЭРУ № 3, ДЗЕ ЗНАХОДЗІЛАСЯ 30 НЯДАЎНА АРЫШТАВАНЫХ, НА ЧАЛЕ З НАЧАЛЬНІКАМ ТУРМЫ ЎВАРВАЛАСЯ БАНДА НАГЛЯДАЛЬНІКАЎ І ПАЧАЛА КАТАВАЦЬ ПАЛІТЫЗНЯВОЛЕНЫХ. БОЛЬШ ЗА ЎСІХ БІЎ САМ НАЧАЛЬНІК І СТАРШЫ НАГЛЯДАЛЬНІК БУХВАЛЬД (ГЭТЫ АПОШНІ, У ЧАСЕ ГАЛАДОЎКІ Ў БЕЛАСТОКУ Ў 1923 ГОДЗЕ ЗАБІЎ ТАВ. ПАНТЭЛЯ І АДБЫЎ 6 МЕСЯЦАЎ ТУРМЫ ЗА ЗАБОЙСТВА КРЫМІНАЛЬНАГА ЗЬНЯВОЛЕНАГА). ПАСЬЛЯ КАТАВАНЬНЯЎ КІНУЛІ ІХ У КАРЦЭРЫ, ДЗЕ СТАРШЫ НАГЛЯДАЛЬНІК МАНЯКОЎСКІ І НАГЛЯДАЛЬНІК КІНЯШЭЎСКІ КАТАВАЛІ ЯШЧЭ НАШЫХ ТАВАРЫШОЎ ЛІТОЎЧЫКА З., І МАКАРЭВІЧА І. (ЛІТОЎЧЫК ПАСЬЛЯ ГЭТАГА ДОЎГІ ЧАС ХВАРЭЎ). У ЧАСЕ ШТУЧНАГА КАРМЛЕНЬНЯ БУХВАЛЬДАМ БЫЛІ ЗБІТЫ А. САЙКО, С. ШАСТАКЕВІЧ, Я. МАХЛІН.

КРЫВАВЫЯ КАТАВАНЬНІ ПАЛІТЫЗНЯВОЛЕНЫХ У ПІНСКАЙ ТУРМЕ НОСЯЦЬ СЫСТЭМАТЫЧНЫ ХАРАКТАР. З МОМАНТУ ВЫВЯЗЕНЬНЯ СТАРЫХ ПАЛІТЫЗНЯВОЛЕНЫХ І ЛІКВІДАЦЫІ ГАЛАДОЎКІ, АМАЛЬ ШТОДНЯ ПАЗАСТАЛЫЯ ПАЛІТЫЗНЯВОЛЕНЫЯ ПАДВЯРГАЮЦЦА КАТАВАНЬНЯМ. 25 ЛІСТАПАДА МІНУЛАГА ГОДУ ПАТРАБАВАНА, КАБ ПАЛІТЫЧНЫЯ ЗЬНЯВОЛЕНЫЯ СКЛАДАЛІ РАПАРТ ПРЫ ЎВАХОДЗЕ Ў КАМЭРУ КАГО-НЕБУДЗЬ З ТУРЭМНАЙ АДМІНІСТРАЦЫІ І КРЫЧАЛІ ХОРАМ «ЧОЛАМ ПАНЕ НАЧАЛЬНІКУ» (НІЗКА КЛАНЯЕМСЯ, ПАН НАЧАЛЬНІК). КАЛІ ПАЛІТЫЗНЯВОЛЕНЫЯ АДМОВІЛІСЯ, ДЫК ТУРЭМНАЯ АДМІНІСТРАЦЫЯ ВЫЦЯГНУЛА НА КАЛІДОР НАШАГА ТАВАРЫША А. САЙКУ, ЯКОГА СТАРШЫ НАГЛЯДАЛЬНІК БУХВАЛЬД ЗБІЎ ДА СТРАТЫ ПРЫТОМНАСЬЦІ, А 3-х ІНШЫХ ТАВАРЫШОЎ ГЭТАЙ САМАЙ КАМЭРЫ ПАСАДЗІЛІ ДА КРЫМІНАЛЬНЫХ, ПРЫЧЫМ АПОШНІМ ЗАГАДАНА БІЦЬ ПАЛІТЫЗНЯВОЛЕНЫХ. ШТОДНЯ, НА ПРАЦЯГУ 3-х ТЫДНЯЎ КРЫМІНАЛЬНЫЯ СТРАШЭННА ІХ ЗЬБІВАЛІ. ГЭТЫМІ ПАЛІТЫЗНЯВОЛЕНЫМІ ЗЬЯЎЛЯЮЦЦА: САКШНАЙДЭР Р., ШАСТАКЕВІЧ С., І ГОЛЬДБЭРГ Х. ПЕРШАГА КРЫМІНАЛЬНЫЯ РАЗЬДЗЕЛІ ДА ГАЛА, ПРЫВЯЗАЛІ РАМНЯМІ ДА ЛАЎКІ І БІЛІ ПАЛКАМІ ДА СТРАТЫ ПРЫТОМНАСЬЦІ. У ЧАСЕ ГЭТАЙ АПЭРАЦЫІ Ў ДЗЬВЯРОХ СТАЯЎ НАГЛЯДАЛЬНІК САБЕЦКІ, ЯКІ ЗААХВОЧВАЎ КРЫМІНАЛЬНЫХ ДА БІЦЬЦЯ. НЕКАЛЬКІ ДЗЁН ПАЗЬНЕЙ ГЭТАЕ-Ж САМАЕ БЫЛО ЗРОБЛЕНА З ПАЛІТЫЗНЯВОЛЕНЫМІ ГЭЛЕРАМ, МАХЛІНЫМ Я., ВЫГУТОВЫМ М., ФЭЛЬДМАНАМ Ю., КАЛІНЧЫКАМ, САЙКО А. І ІНШ. ТАВАРЫШОЎ МАХЛІНА Я. І ВЫГУТОВА М. СТАРШЫ НАГЛЯДАЛЬНІК БУХВАЛЬД І НАГЛЯДАЛЬНІК КІНЯШЭЎСКІ СТРАШЭННА ЗБІЛІ ГУМОВЫМІ ПАЛКАМІ ПА ПАДАЗРЭНЬНІ Ў ПЕРАДАЧЫ ЗАПІСКІ Ў ІНШЫЯ КАМЭРЫ. ПАСЬЛЯ КАТАВАНЬНЯ ІХ ЗАКУЛІ Ў НАЙДАНЫ, СА СКРУЧАНЫХ НАЗАД РУКАМІ І НАПОЎТОЛЫХ КІНУЛІ Ў КАРЦЭР, ДЗЕ НА ЦЭМЭНТАВАЙ ПАДЛОЗЕ ПРАТРЫМАЛІ ЦЭЛЫЯ СУТКІ. А ГЭТА БЫЛО Ў КАНЦЫ ЛІСТАПАДА, КАЛІ ВАДА НА ВУЛІЦЫ ЗАМЯРЗАЛА.

12 СЬНЕЖНЯ МІНУЛАГА ГОДУ ЗАБРАЛІ З КАМЭРЫ ПАЛІТЫЗНЯВОЛЕНЫХ САНДАКА М., АЎСЕЎЧЫКА І., САДОЎНІКА П., БЭРЛЕЛЬКА І. І ПАСАДЗІЛІ ІХ У КАМЭРЫ ДА КРЫМІНАЛЬНЫХ, ПРЫЧЫМ АПОШНІМ ЗАГАДАНА БІЦЬ ІХ КОЛЬКІ ХОЧАШ, ЗА ШТО КРЫМІНАЛЬНЫЯ АТРЫМАЛІ АД СТАРШАГА НАГЛЯДАЛЬНІКА МАНЯКОЎСКАГА КАЎБАСЫ, ПАПЯРОСЫ, СЕЛЯДЦЫ І БУЛКІ. У КАНЦЫ СТУДЗЕНЯ 31 ГОДУ АДМІНІСТРАЦЫЯ ПАТРАБАВАЛА, КАБ ПАЛІТЫЧНЫЯ ЗЬНЯВОЛЕНЫЯ НОЧУЧ МЫЛІ ПАДЛОГУ. КАЛІ ПАЛІТЫЗНЯВОЛЕНЫЯ АД ГЭТАГА АДМОВІЛІСЯ, ДЫК НАГЛЯДАЛЬНІК БУХВАЛЬД МОЦНА ЗБІЎ ПАЛІТЫЗНЯВОЛЕНАГА НЕВЯДОМСКАГА. П. І ПАСАДЗІЎ У КАМЕРУ ДА КРЫМІНАЛЬНЫХ НА «ПАПРАВУ». ПРАЗ НЕКАЛЬКІ ДЗЁН ТОЙ САМЫ НАГЛЯДАЛЬНІК БУХВАЛЬД ВЫКЛІКАЎ НА КАЛІДОР ТАВ. САКШНАЙДЭРА І ЗАГАДАЎ ЯМУ, КАБ ЁН НАМАЎЛЯЎ ТАВАРЫШОЎ МЫЦЬ ПАДЛОГУ НОЧУЧ. КАЛІ САКШНАЙДЭР АДКАЗАЎ, ШТО ЁН МОЖА ТОЛЬКІ АДКАЗВАЦЬ ЗА САБЕ І ШТО НІКОГА НАМАЎЛЯЦЬ НЯ МОЖА, ЗНОЎ БЫЎ ЗБІТЫ ДА КРЫВІ І КІНУТЫ Ў КАМЭРУ ДА КРЫМІНАЛЬНЫХ НА КАТАВАНЬНЕ. ГЭТЫМ РАЗАМ НАШ ТАВАРЫШ СЯДЗЕЎ РАЗАМ З КРЫМІНАЛЬНЫМІ 6 ТЫДНЯЎ І СТАЎ ПАДОБНЫ ХУТЧЭЙ ДА ЖЫВОГА ТРУПА, ЧЫМ НА ЧАЛАВЕКА.

КАЛЯ 6 ТЫДНЯЎ ПАЛІТЫЗНЯВОЛЕНЫЯ НЯ ВЫХОДЗІЛІ НА ПРАГУЛКУ, БО ТУРЭМНАЯ АДМІНІСТРАЦЫЯ ПАТРАБАВАЛА, КАБ ЯНЫ ХАДЗІЛІ ПАРАМІ З РУКАМІ ЗАЛОЖАНЫМІ НАЗАД, АДАБРАЛІ АД ІХ УЛАСНЫЯ РЭЧЫ (ЧАСТКУ ЎЛАСНЫХ РЭЧАЎ АДМІНІСТРАЦЫЯ ПЕРАДАЛА КРЫМІНАЛЬНЫМ), НЕ ДАПУСКАЮЦЦА ГАЗЭТЫ, ХАРЧОВЫЯ ПАСЫЛКІ АД СВАЯКОЎ ДАПУСКАЮЦЦА З АБМЕЖАВАНЬНЕМ, ЛІСТ МОЖНА ПІСАЦЬ ДА СВАЯКОЎ АДЗІН РАЗ У МЕСЯЦ І Г. Д.

ПАЛІТЫЗНЯВОЛЕНЫЯ ПІНСКАЙ ТУРМЫ.

ПРАЛЕТАРЫ БССР КЛЯЙМЯЦЬ ГАНЬБАЮ ПОЛЬСКІХ КАТАЎ

Хваля гневу і абурэньня працоўных мас БССР супроць інквізітарскіх мэтадаў катаваньня і зьдзекаў над лепшымі сынамі пралетарыяту Польшчы, Зах. Беларусі і Зах. Украіны нарастае. З усіх, нават самых глухіх, куткоў БССР бязупынна ў рэдакцыю паступаюць рэзалюцыі пратэсту з патрабаваньнем спыніць руку ката, занесеную над жыцьцём 10.000 палітзьняволеных беларускай Польшчы. У сваіх рэзалюцыях пра цоўныя масы Савецкай Беларусі заклікаюць пралетарыят Польшчы цясьней згуртавацца пад сьцягамі гераічнай кампартыі Польшчы для нанесьня апошняга рашучага ўдару фашысцкай дыктатуры. Усюды ў часе мітынгаў рабочыя адлічваюць пэўны процант свайго заработку, а таксама зьбіраюць сродкі па падпісных лістох на дапамогу палонькам капіталу.

Так, калектыў работнікаў Дзяржпляну БССР у сваёй рэзалюцыі-пратэсьце супроць крывавага паходу беларускай паліцэйшчыны на лепшых барацьбітоў за сусьветны Кастрычнік пастанаўляе:

— Усе, як адзін, пратэстуем супроць інквізітарскіх катаваньняў палітзьняволеных польскіх турмаў. У адказ на белы тэрор уступаем у рады МОПР'у. На падтрыманьне палітзьняволеных і іх сем'яў уносім 500 руб. і выклікаем калектывы ЦВК, СНК і Наркамфіну БССР.

Няхай ведаюць палітзьняволеныя фашысцкай Польшчы, што яны ў сваёй барацьбе не адны, што з імі мільёны.

* * *

Агульны сход калгасьнікаў калгасу «Віцебскі пралетары» гнеўна пратэстуе супроць разьюшанага белага тэрору ў турмах фашысцкай Польшчы.

Калектыў заклікае працоўных Польшчы, Зах. Беларусі і Зах. Украіны, не пакладаючы рук, весьці барацьбу супроць фашысцкай дыктатуры і шле брацкае прывітаньне палонькам капіталу.

Апрача гэтага рэзалюцыі пратэсту супроць зьверстваў фашысцкіх турэмных «малайцоў» атрыманы ад агульнага сходу рабочых і служачых групкому № 2 жыльлёвай каапэрацыі, ад аб'яднанага сходу рабочых, студэнцтва акадэміі, інстытуту і рабфаку разам з прафсаюзамі гор. Горак, ад калгасьнікаў сельгасарцелі імя Молатава, Караліўснага сельсавету, і інш.

Спаліць запасы пшаніцы—

Вось капіталістычнае „вырашэньне" крызісу зямляробўстве

НЬЮ-ЁРК. «Я рэкамэндую, каб фэрмэрскае бюро пагрузіла свае запасы пшаніцы коштам у 200 млн. даляраў на цягніку, адвезла-б іх у Куні-Айлянд і там-бы спаліла гэтыя запасы».

Так гаворыць не які-небудзь прастак, а—«мазгі капіталу», адвакат Генры Ворд Бір, які стаіць па чале федэральнай асацыяцыі юрыстаў Нью-Ёрку, Нью Джэрсі і Канэктыкоту.

Адначасова сельгаскіраўніцтва ў Вашынгтоне прапанавала фэрмэрам зьнішчыць адну трэцюю частку новага ўраджаю бавоўны для таго, каб зьменшыць вяпізарныя запасы, якія стараюць, паводле слоў кіраўніцтва, «простую пагрозу краху ў бавоўняных раёнах», якія (запасы) ўкосна падрываюць дабрабыт нацыі.

Буржуазныя эканамісты вылічваюць новы ўраджай бавоўны ў 15.500 тыс. кілё. Цэны па бавоўну зьнізіліся. Сельгаскіраўніцтва абяцае фэрмэрам, што калі яны прымуць гэту прапанову, дык кіраўніцтва ўстрымаецца ад продажу сваіх наяўных запасаў бавоўны да ліценя наступнага году. Плянтатары бавоўны ў паўдзённых штатах высьмейваюць прапанову сельгаскіраўніцтва.

Спаліць запас збожжа коштам у 200 млн. даляраў ва ўвесяліцельным цэнтры Куні-Айляндзе і зьнішчыць адну трэцюю ўраджаю бавоўны ў той час, як 10 млн. беспрацоўных ня маюць хлеба і ходзяць напоўразьдзетымі—вось да чаго дадумаліся капіталістычныя мудрацы. Лепшых фактаў, лепшага сьведчаньня аб поўным банкрутстве капіталістычнай сыстэмы, аб поўным разлажэньні капіталізму і ня прыдумаеш.

СТАРЫ ВЕРНЫ СЛУГА

Урад мае намер напраўіць фінансавае становішча шляхам зьніжэньня зарплаты. Міністэрства заявіў: «Лейбарыстскі ўрад пастановіў ураўнаважыць бюджэт любой цаною». (З газэт).

— Ну, як у цябе там?
— Не «извольте» непакоіцца, усё будзе зроблена.
— Ня ў пяршыню.

Працоўныя Польшчы на шляху да жабрацтва

Падзеньне кан'юнктуры

Пагаршэньне гаспадарчага становішча ў фашысцкай Польшчы адбываецца бязупынна шпаркімі тэмпамі. Падзеньне кальюктуры на ўнутраным рынку выявілася ва ўзмоцненым скарачаньні збыту, што адбываецца з прычыны зьмяншэньня інвэстыцыі ў прамысловасьці, надзвычайнага зьмяншэньня пакупаў вясковага і гарадзкога насельніцтва.

Скарачэньне спажываньня некаторых найбольш характэрных для рынку вырабаў за першыя пяць месяцаў б. г. у параўнаньні з тым самым пэрыядам мінулага году прадстаўляецца так: спажываньне вугалю зьменшылася на 9,4 проц., пракатнага жалеза на 40 проц., цэменту на 38 проц., нафты на 7,7 проц., цукру на 50 проц., дрожджаў на 3,7%, тытуну на 10 проц., солі на 4,6 проц., запалак на 34,5 проц., Гэтыя лічбы ярка сьведчаць аб надзвычайным зьбядненьні шырокіх працоўных мас фашысцкай Польшчы.

У Заходняй Беларусі працэс гаспадарчага развалу з прычыны жорсткага капіталістычнага ўціску адбываецца яшчэ больш шпарка і паказальна.

У зьвязку з цяжкім гаспадарчым становішчам, а таксама з-за адсутнасьці цяжкіх сродкаў у гандлёва-прамысловых прадпрыемствах наглядаецца вялізарны рост вэксэльных пратэстаў. На працягу ліпеня на абшарах адзнаго толькі Віленскага ваяводзтва апратэставана вэксэляў на суму 1.012 тыс. злотых.

Паводле праведзеных досьледаў, кошт утрыманьня ў мінулым месяцы павялічыўся на 1,2 проц. Дарагоўля найболей закранула рэчы першай патрэбы. У Вільні будаўніцтва зусім замерла. Паводле статыстычных даных у пэрыяд ад 1 студзеня да 1 жніўня ў Вільні скончыла самагубствам 132 чалавекі. Амаль усе яны адбыліся з прычыны адсутнасьці сродкаў да існаваньня і цяжкіх матар'яльных умоў.

Забастоўка сэзоньнікаў у Бярэставіцкім павеце

ВІЛЬНЯ. 17. (БЕЛТА). Нядаўна ў Бярэставіцкім павеце (Гарадзеншчына) прыступіла да працы 160 сэзонных рабочых, сярод якіх 90 проц. моладзі. 100 рабочых, занятых на сенаўборцы, патрабуюць павышэньня зарплаты з 1,5 злотых да 2 злотых (злоты — 22 кап.) і з 2 злотых да 2,5 у дзень, 3-гадзіннага працоўнага дня, дастаўкі вады ў часе працы ў поле, пазбаўленьня ад наглядчыкаў і т. д.

Пад кіраўніцтвам прафсаюзнай ячэйкі пачалася забастоўка. У 9 пунктах выбраны забастовачныя камітэты. Праведзена канфэрэнцыя гатых камітэтаў. Настрой бастуючых баявы.

Намеры памешчыкаў праводзіць работы пры дапамозе штрэйкбрахераў сустрэлі энэргічны адпор з боку ня толькі бастуючых, але і сялян акалічных вёсак. Сяляне з далёкіх мясцовасьцяй, якіх прывялі на работу, пасьля растлумачэньня ім, у чым справа, пакінулі працу, салідарызуючыся з бастуючымі.

Памешчыкі прабуюць зламаць забастоўку пры дапамозе паліцэйскага тэрору. Праведзены масавыя арышты. Трое рэвалюцыйных сялян адвезены ў Ваўкавыск у дэфэнзыву, дзе яны страшэнна зьбіты. Ня гледзячы на шалёны фашысцкі тэрор, сэзоньнікі ня спыняюць барацьбы і з рашучасьцю давядуць яе да пераможнага канца.

Рабочыя Беластоку пакідаюць рады сацыял-фашыстаў

ВІЛЬНЯ. (БЕЛТА). 16. У Беластоку да нядаўняга часу прафсаюз будаўнікоў знаходзіўся пад уплывам сацыял-фашыстаў. На сходзе рабочых, які гэтымі днямі быў склікан прафсаюзнай дэлегацыяй, рабочыя пастанавілі пакінуць сацыял-здрадніцкіх прадаўроў і арганізаваць свой клясавы прафсаюз будаўцікоў з левым праўленьнем. У сацыял-фашыстаў застаўся толькі... прафсаюзны апарат з пячаткай.

У Гарадну на тартаках (лесазаводы) звольнены з работы на загаве Беластоцкага старосты дэлегат сакзнай лавіцы. Рабочыя энэргічна запратэставалі супроць гэтага і правялі сярод сябе грашовы збор у карысьць дэлегата.

У Супрасьлі (Беластоцкі павет) на тэкстыльнай фабрыцы, дзе працуе каля 500 рабочых, знаходзіцца некалькі падкупленых фабрыкантамі і дэфэнзывай рабочых. Рабочыя іх выкрылі і патрабавалі звальненьня з фабрыкі. Работніцы і жоны рабочых павыбівалі ў абурэньні шыбы ў іх кватэрах.

«Зьвязда»

„Панскае, няхай гарыць"

Фашысцкая газэта «Варшаўская ранка» 15 жніўня падае вельмі характэрны факт, які ярка паказвае настрої працоўных у адносінах да буржуазіі і фашысцкай улады.

Гэтымі днямі з невядомай прычыны здарыўся вялікі пажар у двох графа Тараноўскага каля Старпякова. Агонь пашыраўся з надзвычайнай хуткасьцю. Звыш сотні дзесяцін старога лесу выгарала пагібель, калі не пераляцелі ровам частку лесу, якой пагражаў пажар.

Тысячы беспрацоўных мястэчка вышлі паглядзець на пажар, але ніхто з іх нават і не падумаў тушыць пажар. Раптам аьявіўся паліцэйскі атрад, які накінуўся на натоўп з крыкам: «усе на лапаты, сякеры, тушыць лес!» Ніхто нікаказам — злы сьмех.

— Панскае, няхай гарыць.

— Вачыце іх, народ будуць прыгнетаць, бо гарыць граф — чуюць пазасы.

На тушэньне пажару прыбыла [illegible] жуазія, якая знаходзілася ў вакольным санаторыі.

„ЧЫРВ. ЗОРКА" Пач.: 7, 8-45 і 10-30 — МІС МЭНД у 3-х сэрыях 21 частны. Другая сэрыя 9 10 частнах
„Культура" — ЖАЛЕЗНАЯ БРЫГАДА
Звыш. прагр. Часоп. БДК № 14
Інтэрнацыянал Пач. у 7 г. в. — Выбатны бытавы фільм Парысні шавец
„Пралетары" Адкр. з 12 г. дня. — ішумсўш. фільм паводле раману БОЙНІЧА ОВАД У галоўн. ролі НАТА ВАЧНАДЗЭ
„Юны Піянэр" (будзінак кіно „Культура") — Янка Мсьцівец У гал. ролі НЯМЕЦКАЯ ЯЎЧАРКА „ТАСО" Пачатак у 2 гадз. дня.
„СПАРТАК" Пач. у 7, 9, 11 Каса—з 6 гадз. — КРЭСТ І МАУЗЭР Драма ў 8 частках.

БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ВЫШЭЙШЫ ПЭДАГАГІЧНЫ ІНСТЫТУТ (РЭАРГАНІЗАВАНЫ З ПЭДФАКУ БДУ)
абвяшчае асьнны набор студэнтаў на наступныя факультэты і аддзяленьні:
I. Сацыяльна-эканамічны ф-т.
а) аддз. эканомікі—60 асоб, з іх беларуская сэкцыя—30 асоб і яўрэйская сэкцыя—30 асоб. Аддзяленьне рыхтуе выкладчыкаў эканамічных дысцыплін у тэхнікумах, рабфаках і ФЗН.
II. Літаратурна-лінгвістычны ф-т.
а) на аддзяленьне раздзяляйне-выдавецкае, якое рыхтуе стыльрэдактароў для выдавецтваў і рэдакцый буйных газэт—прымацца 30 асоб.
III. Пэдалёга-пэдагагічны ф-т.
а) на аддз. пэдалёгічнае, якое рыхтуе выкладчыкаў пэдалёгіі і навуковых працаўнікоў для дасьледчых устаноў—прымацца 30 асоб;
б) на інспэктарскае аддз., якое рыхтуе інспэктароў нарасьветы і кіраўнікоў буйных навучальных устаноў—прымацца 30 асоб.
Заявы з дакумэнтамі, вызначанымі ў даведніку НКА, прымаюцца ў канцылярыі пэдінстытуту (Менск, Унівэрсытэцкі Гарадок, прыродазнаўчы корпус) да 20 жніўня 1931 г. Іспыты для тых таварышоў, якія ня маюць сярэдняе асьветы, будуць праводзіцца 27, 28 і 29 жніўня. Аб тэрміне пачатку заняткаў будзе паведамлена асобна. Правілы прыёму абвешчаны ў даведніку НКА.
Настаўнікі прымаюцца толькі па прадстаўленьні даволу ад райінспэктароў нарасьветы.
Стыпэндыямі і інтэрнатамі забясьпечваецца 70 проц. студэнцтва.
ДЫРЭКТАР ІНСТЫТУТУ В. РУДНІЦКІ.

Інстытут водна-мэліярацыйны і арганізацыі тэрыторыі
Ў дадатак да сваёй абвесткі ў газ. „Зьвязда" ад 29 чэрвеня 1931 г. № 173, абвяшчае што тэрмін прыёму заяў для паступленьня ў інстытут працягнут да 10 верасьня 1931 г.
Тэрмін іспытаў з 15 да 5 верасьня. Заняткі пачнуцца з 1 кастрычніка.
ДЫРЭКЦЫЯ.

КОШТ публікацыі аб згубе 1 дакумэнту 1 р.

Беларускі Дзяржаўны Унівэрсытэт
абвяшчае асьнны набор студэнтаў на наступныя факультэты:
1. Фізыка матэматычны (беларуск. і яўр. сэкцыі)
2. Хімічны (беларуск. сэкцыя)
Заявы прымаюцца да 20 жніўня г. г. у канцылярыі БДУ (Менск, Унівэрсытэцкі гарадок, галоўны корпус).
Іспыты для тых таварышоў, якія ня маюць сярэдняе асьветы, будуць праводзіцца 27, 28 і 29 жніўня. Правілы прыёму абвешчаны ў даведніку НКА.
70 проц. прынятых студэнтаў забясьпечваюцца стыпэндыямі і інтэрнатам. Для самей студэнтаў БДУ кватэр не прадстаўляе.
Аб тэрміне пачатку заняткаў з новым наборам будзе паведамлена асобна.
ЧВП Рэктара БДУ В. Рудніцкі.

БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ІНСТЫТУТ БУЙНОЙ РАГАТАЙ ЖЫВЁЛЫ
працягвае прыём заяў
аб паступленьні ў Інстытут на аддзяленьні: 1) буйной рагатай жывёлы (рыхтуе спэцыялістаў жывёлаводаў вышэйшай кваліфікацыі для маточных саўгасаў і на лочна-таварных малочных фэрмах); 2) малочнае справы (рыхтуе спэцыялістаў тэхналёгаў вышэйшай кваліфікацыі па перапрацоўцы малака ва ўсе віды ключнай прадукцыі); 3) праводзіць набор на аддзяленьне эканомікі і плянаваньня (рыхтуе спэцыялістаў вышэйшай кваліфікацыі эканамістаў плянавікоў у галіне жывёлаводчых гаспадарак).
Тэрміны падачы заяў працягнут да 10 верасьня.
Іспыты з 10 па 20 верасьня. Заняткі з 1 кастрычніка.
Заявы падаваць на імя прыёмнай камісіі інстытуту буйной рагатай жывёлы, г. Горкі, БССР.
ДЫРЭКЦЫЯ.

ПРЫЁМ ЗАЯЎ у Беларускі Дзяржаўны Інстытут мэтавых культур і аграхіміі на 1-шы курс.
працягнут да 10-га верасьня.
Іспыты праводзяцца з 15 па 25 верасьня.
Заняткі распачнуцца 1-га кастрычніка.
Адрас: г. Горкі, Інстытут Кармавых культур і аграхіміі.
Дырэкцыя.

ПРЫЁМ ЗАЯЎ у Беларускі Дзяржаўны Інстытут Прадзільных Культур на 1-шы курс
працягнут да 10 верасьня 1931 г.
Іспыты праводзяцца з 15 па 25 верасьня 1931 г.
Заняткі распачынаюцца з 1-га кастрычніка 1931 г.
Заявы з дакумэнтамі накіроўваць па адрасе: г. Горкі, Дзяржаўнаму Інстытуту Прадзільных Культур.
Дырэктар Інстытуту Брытаў.

БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ВЫШЭЙШЫ ВЯЧЭРНІ ПЭДІНСТЫТУТ
абвяшчае прыём студэнтаў на наступныя факультэты і аддзяленьні:
I. Літаратурна-лінгвістычны ф-т.
а) Аддз. літаратурна-пэдагагічнае . . . 30 асоб.
II. Пэдалёга-пэдагагічны ф-т.
а) Аддз. пэдалёгічнае . . . . . 30 асоб.
Заявы прымаюцца ў канцылярыі Пэдінстытуту (Менск, Унівэрсытэцкі Гарадок, прыродазнаўчы корпус) да 10 верасьня 1931 г. штодзённа, акрамя 5, 10, 15, 20, 25, 30 чысла кожнага м-цу.
Пачатак заняткаў 1-га кастрычніка 1931 году. Правілы прыёму тыя-ж, што і на дзенны Пэдінстытут, якія абвешчаны ў даведніку НКА.
Стыпэндыямі і інтэрнатамі студэнты вячэрняга Пэдінстытуту не забясьпечваюцца.
Дырэктар Пэдінстытуту В. РУДНІЦКІ.

Цэнтральная калгасная школа
РАСПАЧНЕ ЗАНЯТКІ пасьля канікул 20 жніўня г. г.
Слухачам прыбыць без спазьненьня.
Дырэкцыя ЦКШ.

ПРЫЁМ ЗАЯЎ У ГОМЕЛЬСКІ АГРА. ПЭДІНСТЫТУТ
на фізыка-тэхнічнае і хэміка-біялёгічнае аддзяленьні, а таксама на пэльрупу тых жа аддзяленьняў
працягнуты да 15 верасьня.
Заявы накіроўваць: Гомель, Пралетарская № 2, канцылярыя Агра пэдінстытуту.
Заняткі з новым наборам пачнуцца з 1-X—31 г.
Дырэкцыя.

Нова-арганізаванаму Кіраўніцтву мясцовай Прамысловасьці БССР
ПАТРАБУЮЦЦА:
Інжынэры-будаўнікі, кераміка, дрэваапрацоўшчыкі, па торфу, а таксама тэхнікі, эканамісты, працаўнікі па снабжэньні, адна машын